**Организация** проектной и исследовательской деятельности учащихся : материалы науч.-практ. конференции : 27–28 апреля 2023 г. / редкол. : Ф. В. Дробеня [и др.] ; ГУО «Мин. обл. ин-т развития образования». – Минск : Мин. обл. ин-т развития образования, 2023. – 222 с.
ISBN 978-985-7225-57-6.

# ФАРМІРАВАННЕ ТВОРЧЫХ УМЕННЯЎ НАВУЧЭНЦАЎ ПРЫ НАПІСАННІ ВОДГУКУ НА МАСТАЦКІ ТВОР

***Зразікава Валянціна Аляксееўна,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
*ДУА «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі»*

Актуальнасць абранай тэмы абумоўлена тым, што мадэрнізацыя і ўдасканаленне адукацыйнага працэсу на сучасным этапе развіцця прадугледжвае павышэнне якасці практычнай і творчай падрыхтоўкі навучэнцаў. Багатым патэнцыялам развіцця і выхавання творчых здольнасцей вучняў валодаюць урокі беларускай мовы і літаратуры, падчас якіх фарміруюцца не толькі прадметныя камунікатыўныя кампетэнцыі, але і маўленчая культура асобы.

Да асноўных спосабаў выпрацоўкі творчых уменняў належыць комплексная сістэматычная работа па напісанні водгуку. Дзякуючы гэтаму фарміруецца разуменне цэласнасці аўтарскага твора, уменне вызначаць яго праблематыку, ідэю, кампазіцыю, вобразна-выяўленчыя сродкі, а таксама афармляць уласныя думкі ў самастойнае, лагічна і структурна завершанае выказванне. Галоўнае ў водгуку – гэта выражэнне эмацыянальна-ацэначнага, асобаснага стаўлення да прадмета маўлення. Такі суб’ектыўны падыход у выбары зместу раскрывае найперш пазіцыю аўтара водгуку: яго адносіны да праблемы твора, чытацкі і жыццёвы вопыт, узровень валодання мовай, аб’ём літаратуразнаўчых ведаў.

Нягледзячы на тое, што спецыфіка работы над водгукам разгледжана ў вучэбна-метадычнай літаратуры [1 ; 4 ; 5], а ў педагагічнай практыцы існуюць розныя прыёмы, якія дапамагаюць рыхтаваць вучняў да напісання водгуку, настаўнікі па-ранейшаму маюць патрэбу ў дэталёвых метадычных распрацоўках.

З водгукам на ўроках беларускай мовы вучні знаёмяцца ў 8-м класе пры разглядзе тэмы «Сказы з аднароднымі членамі: будова, значэнне, ужыванне» (9 гадзін, 2 з якіх – пісьмовыя работы) [2]. Аднак у падручніку (§ 36) для выпрацоўкі адпаведнага ўмення прапанавана некалькі практыкаванняў (289–291), дзе даецца азначэнне паняцця (на прыкладзе водгуку на кнігу), парады па напісанні водгуку на прачытаны твор (кнігу) і практычнае заданне. Як пры такіх абмежаваных па часе і аб’ёме магчымасцях настаўніку навучыць, а вучню навучыцца пісаць водгук?

Перад гэтым у 7-м класе аналізуецца схема пабудовы разважання як асобнага тыпу маўлення (тэзіс, доказ, вывад), якую можна выкарыстоўваць і ў дачыненні да водгуку. Аднак далей у падручніках па беларускай мове для 9-га класа водгук не ўзгадваецца, за выключэннем некаторых тэм, фрагментарна ці ўскосна з ім звязаных: «Аналіз біяграфій беларускіх пісьменнікаў ці лінгвістаў», «Вызначэнне паслядоўнасці развіцця думкі ў залежнасці ад жанру і стылю тэкстаў», «Абгрунтаванне мэтазгоднасці выкарыстання выяўленчых моўных сродкаў, у тым ліку сказаў з рознымі відамі сувязі частак», «Цытаты, іх роля ў выказванні, афармленне на пісьме. Эпіграф», «Паўтарэнне складаных пытанняў арфаграфіі і пунктуацыі».

У падручніку па беларускай літаратуры за 10-ты клас прыведзены алгарытмы аналізу паэтычнага і празаічнага твораў (на прыкладзе верша «Летапісец» Максіма Багдановіча і апавядання «Бондар» Змітрака Бядулі), асветлены пытанні тэорыі літаратуры: што такое верлібр, мастацкія тропы, лірычны герой, лірычнае «я» і аўтар.

Асноўная ж работа па фарміраванні навыкаў напісання водгуку рэалізуюцца ў межах вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў «Рыхтуемся да алімпіяды: водгук, вуснае выказванне», зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 10.06.2020 № 124 і адрасаванай вучням X, XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі [7]. Праграма разлічана на 70 гадзін і ўтрымлівае раздзелы, прысвечаныя вывучэнню водгуку як асобнага жанру, яго кампазіцыі, зместу, мастацкім і моўным сродкам.

РЕПОЗИТОРИЙ МОИРО

Па сутнасці на факультатыўных занятках і адбываецца ўсебаковая падрыхтоўка вучняў да напісання водгуку. Пры гэтым творчыя тэхналогіі, формы і метады кожны настаўнік выбірае самастойна. Таму відавочна неабходнасць распрацоўкі агульных метадычных рэкамендацый па творчым аналізе мастацкага тэксту, увядзенню ў слоўнік навучэнцаў маўленчых клішэ і канструкцый, прызначаных для афармлення чытацкіх уражанняў.

Перад напісаннем водгуку на мастацкі твор (празаічны ці паэтычны) вучню неабходна навучыцца аналізаваць розныя водгукі, вылучаць у іх моцныя і слабыя бакі, абгрунтоўваць сваю пазіцыю, праз комплекс практыкаванняў выпрацаваць уласныя творчыя прыёмы. Гэта патрабуе ўспрыманне твора як звязнай і арганізаванай структуры з уступам, асноўнай часткай, заключэннем. Важна асэнсаваць маўленчую сітуацыю, выбраць моўныя сродкі для раскрыцця тэмы, вызначыцца з аптымальнай кампазіцыйнай схемай для свайго разважання.

У артыкуле прадстаўлены толькі адзін з элементаў такой работы – падбор заданняў, якія можна выкарыстоўваць для набыцця неабходных уменняў для далейшай комплекснай ацэнкі мастацкага выказвання:

1. Прачытайце твор і вызначце яго а) тэму; б) ідэю; в) кампазіцыю; г) мастацкі вобраз (вобраз-персанаж, вобраз-алегорыя, вобраз-з’ява, вобраз-пейзаж, вобраз-прадмет).

2. Праілюструйце прыкладамі з мастацкіх тэкстаў сцверджанне аб тым, што ідэя можа раскрывацца праз розныя элементы твора: назву; эпіграф; фармулёўку з некалькіх сказаў; выказванні героя; аўтарскія разважанні; увесь змест твора.

3. Суаднясіце паняцці з прыведзенымі азначэннямі:

1) Тып эмацыянальна-каштоўнаснай накіраванасці твора (можа быць гераічным, драматычным, трагічным, сатырычным, сентыментальным, рамантычным).

2) Прадмет мастацкага ўзнаўлення ў творы (факты, падзеі, учынкі, перажыванні).

3) Вострае грамадскае пытанне, пастаўленае ў літаратурным творы.

4) Галоўная думка, той погляд, які даводзіцца аўтарам у творы.

А. Праблематыка

Б. Ідэя

В. Пафас

Г. Праблема

Д. Тэма

4. Падрыхтуйце паведамленні (1–2 старонкі): «Тэмы, вобразы, ідэі грамадзянскай беларускай лірыкі», «Тэмы, вобразы, ідэі філасофскай беларускай лірыкі», «Тэмы, вобразы, ідэі пейзажнай беларускай лірыкі», «Тэмы, вобразы, ідэі інтымнай беларускай лірыкі».

Адной з крыніц атрымання ведаў па гэтых тэмах могуць быць навуковыя даследаванні, метадычны патэнцыял якіх асэнсаваны настаўнікамі не ў поўнай ступені: У. В. Гніламёдаў «Ад даўніны да сучаснасці: нарысы пра беларускую паэзію», А. І. Бельскі «Жывая мова краявідаў: пейзаж у беларускай паэзіі», А. А. Бараноўскі «Беларуская філасофская лірыка мяжы XX–XXI стагоддзяў», А. В. Брадзіхіна «Сучасная беларуская інтымная лірыка: тэндэнцыі і перспектывы развіцця».

5. Якія тэрміны адпавядаюць прыведзеным дэфініцыям? Запішыце іх і дапоўніце сваімі прыкладамі з твораў.

1) Стылістычная фігура, якая змяшчае яўнае ўказанне або выразны намёк на які-небудзь факт (літаратурны, гістарычны, міфалагічны).

2) Паўтарэнне аднародных або падобных зычных гукаў у вершаваных радках (празаічнай фразе), якое ўзмацняе гукавую і інтанацыйную выразнасць твора.

3) Паэтычны прыём, заснаваны на паўтарэнні аднолькавых слоў ці словазлучэнняў у пачатку вершаваных радкоў, строф або празаічных сказаў.

4) Стылістычная фігура, сутнасць якой заключаецца ў кантрасным супастаўленні процілеглых перажыванняў, думак, вобразаў для ўзмацнення ўражання ад гэтых з’яў ці выяўлення іх супярэчнасці.

5) Паўтарэнне ў вершаваных радках або празаічных сказах галосных гукаў з пэўнай выяўленчай мэтай.

6) Мастацкі прыём перабольшвання ўласцівасцей, якасцей ці памераў прадмета або з’явы з мэтай мастацкай выразнасці.

7) Сугучнасць радкоў, калі рыфмуюцца другі радок з трэцім, а першы з чацвёртым.

8) Аднаскладовая рыфма, у якой сугучныя толькі апошнія склады зарыфмаваных слоў.

РЕПОЗИТОРИЙ МОИРО

9) Прыпадабненне аднаго прадмета ці з'явы да другога прадмета ці з'явы, чым-небудзь падобнага да першага.

10) Форма лірычнага верша, які складаецца з васьмі радкоў з рыфмоўкай абаа абаб, дзе першы радок паўтараецца тройчы, а другі – двойчы.

6. Ахарактарызуйце ў творы асаблівасці:

а) гукапісу (эўфанічныя сродкі): алітарацыя, асананс, гукаперайманне;

б) лексікі (лексічныя сродкі): ужыванне слоў пэўнай часціны мовы; стылістычна нейтральныя і афарбаваныя словы, словы агульнаўжывальныя і абмежаванага ўжытку: дыялектызмы, устарэлыя словы (гістарызмы і архаізмы), неалагізмы (у тым ліку аўтарскія); фразеалагізмы, сінонімы, антонімы, амонімы, полісемія (калі ёсць);

в) мастацкіх тропаў (лексіка-семантычныя сродкі выразнасці): метафара, персаніфікацыя, сімвал, алегорыя, гіпербала, літота, параўнанне, эпітэт, каламбур, парадокс, метанімія, сінекдаха, аксюмаран, антытэза, перыфраза, плеаназм, эўфемізм;

г) сінтаксісу (сінтаксічныя сродкі): наяўнасць сказаў пэўных канструкцый (простыя і складаныя, аднасастаўныя і двухсастаўныя, поўныя і няпоўныя); фігуры маўлення: паўтор, анафара, ампліфікацыя, дыяфара, інверсія, эліпсіс, паралелізм, рытарычныя пытанні, звароткі.

Пры выкананні падобных заданняў асобнай увагі настаўнікаў заслугоўвае вучэбны дапаможнік «Лінгвістычны аналіз тэксту», у якім падрабязна даследуецца выяўленчая выразнасць тэксту на розных моўных узроўнях і прыводзяцца шматлікія прыклады з твораў (раздзел 2) [7].

Акрамя гэтага, можна выкарыстоўваць і матэрыялы з навуковых работ І. Я. Лепешава «Лінгвістычны аналіз тэксту», П. У. Сцяцко «Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў».

7. Адзначце спецыфіку паэтычнай арганізацыі твора (строфіка, рытмічная арганізацыя, вершаваны памер, рыфма): колькасць радкоў, строф; велічыня страфы (двухрадковая, чатырохрадковая, васьмірадковая); кампазіцыя строф; даўжыня радкоў; рыфма (ёсць/няма, словы, якія рыфмуюцца).

Паколькі гэта даволі складаная для засваення тэма, можна прапанаваць вучням на аснове дапаможніка В. П. Рагойшы «Тэорыя літаратуры ў тэрмінах» скласці свой літаратуразнаўчы слоўнік.

Прааналізаваўшы розныя падыходы да комплекснага асэнсавання твора, мы прыйшлі да высновы, што на этапе чытання мэтазгодна выкарыстоўваць метад трох чытанняў, аўтарам якога з'яўляецца Дзмітрый Доўгаль [3]. У аснове распрацаванай ім тэорыі знаходзіцца паўзроўневая класіфікацыя эмацыянальнага, ідэйна-вобразнага, стылістычнага складнікаў тэксту (адзінства эмоцый, зместу і формы).

Гэты падыход заслугоўвае асобнага вывучэння і апрабацыі, бо, як адзначае сам даследчык, дазваляе пры напісанні водгуку не забыцца ні на адзін з крытэрыяў, важных пры ацэнцы работы; дэманструе ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць кампанентаў літаратурнага твора; дапамагае весці працу над водгукам услед за ўспрыманнем тэксту чытачом. Пасля азнаямлення з метадам пачынаецца непасрэдная праца над творам: сумеснае чытанне і абмеркаванне тэксту, складанне карт успрымання літаратурнага твора, напісанне водгукаў, іх праверка, параўнанне з іншымі водгукамі, узаемаацэньванне, карэкцыйная праца [3, с. 88].

У заключэнне адзначым, што водгук адносіцца да тыпу пісьмовых работ, які спрыяе развіццю творчых здольнасцей вучня. Аднак гэта патрабуе і ад настаўнікаў, і ад вучняў сур'ёзнай крапатлівай работы, пераадолення шэрагу праблем: абмежаванасць часу, адсутнасць грунтоўных метадычных распрацовак, недастатковы (у параўнанні з іншымі відамі маўленчай дзейнасці) узровень валодання прадуктыўным пісьмовым маўленнем.

Таму адным з эфектыўных спосабаў падрыхтоўкі вучняў да водгуку і фарміравання ў іх творчых уменняў з'яўляецца аналіз мастацкіх тэкстаў (празаічных ці вершаваных). Паэтапная аналітычная работа з тэкстамі, выкананне комплексу практыкаванняў і заданняў, накіраваных на актывізацыю творчай дзейнасці, дазволяць вучням не толькі зразумець і асэнсаваць тое, пра што ім трэба пісаць, але і як у працэсе творчай камунікацыі, абапіраючыся на атрыманыя веды і ўменні, эфектыўна выразіць свае пачуцці і думкі словамі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Алімпіяды па беларускай мове і літаратуры: водгук на мастацкі твор : вуснае выказванне / В. У. Праскаловіч [і інш.]. – Мінск, 2020. – 262 с.

2. *Бадзевіч, З. І.* Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 8-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 260 с.

РЕПОЗИТОРИЙ МГУ

3. *Доўгаль, Д.* Вучымся пісаць водгук: спроба алгарытмізацыі творчага працэсу / Д. Доўгаль // Роднае слова. – 2008. – № 10. – С. 88–93.

4. *Куліковіч, У. І.* Алімпіяды па беларускай мове і літаратуры : заданні да комплекснай работы : водгук на мастацкі твор : вуснае выказванне / У. І. Куліковіч. – Мінск : Аверсэв, 2014. – 639.

5. Рыхтуемся да напісання водгуку на літаратурны твор / склад. Р. П. Ільіна, С. М. Краскоўская. – Мінск : МАІРА, 2013. – 75 с.

6. *Станкевіч, А. А.* Лінгвістычны аналіз тэксту : вучэбны дапаможнік / А. А. Станкевіч. – Гомель : ГДУ, 2018. – 198 с.

РЕПОЗИТОРИЙ МОИРО